Воўк унурыў галаву ў плечы яшчэ больш згорб..ўся прыўзняў азадак падняў хвост як згатов..ўся накінуцца. Але Валошка быў спакойны. У гэтай грознай паставе ваўка ён убачыў (не) толькі гатоўнасць кінуцца на чалавека але і такую ж гатоўнасць бегчы ад яго.

В. Карамазаў

**Заданне 15. Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі.**

1. Пушча праглынула іх, і праз колькі часу ўжо не верылася, што недзе свеціць яркае сонца.

2. Як прыгожа жнеі жалі жыта, дасканалым рухам перахопліваючы сцяблы, спрытна падразаючы іх увішным сярпом, а потым непрыкмет-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ным намаганнем узмахвалі жменяй зрэзанага жыта над галавой, каб пакласці ў сноп.

3. Вуліцы старога Гродна разбягаюцца радыусамі, з-за муроў глядзяць купы дрэў, і ў іхняй зелені вельмі прыгожа выглядае чырвоная чарапіца, абмытая дажджом.

4. Далей, за грудком, серабрыліся пірамідальныя таполі — таксама знак даўнейшых алеяў, што вялі ў панскі двор.

5. Усё было прыбрана гладка, але Максіму здавалася, што варта толькі зірнуць аб'ездчыку, каб прымеціць, што не хапае аднаго дуба.

**Заданне 16. Вызначце тып аднасастаўнага сказа.**

1. Дыхнула вільгаццю і пахам сапрэлага лісця.
2. Ціхая вуліца, матчын агародчык, кветкі.
3. Спыняемся і выходзім з машыны.
4. Прыгажосць трэба берагчы, а не знішчаць.
5. Нізіны зацягнула туманам.
6. Любой цаной пазіцыі трымаць.
7. З незабітага звера футра не шыюць.
8. Гляджу ў будучыню з надзеяй.
9. Не саромейся, беларус, гаварыць на роднай мове.
10. Палотны беляць на росах чыстых і ясным сонцам абаграваюць.

## Тэст № 1

1. **Адзначце словы, вымаўленне і напісанне якіх супадае:**
   а) дзіўны;
   б) скінуты;
   в) сліва;
   г) прыедзьце;
   д) (у) плашчы.
2. **Адзначце словы, вымаўленне і напісанне якіх не супадае:**
   а) не мог;
   б) выдавецкі;
   в) радуешся;
   г) згінаць;
   д) дажджлівы.
3. **Адзначце словы, у якіх аднолькавая колькасць гукаў і літар:**
   а) весялосць;
   б) здароўе;
   в) голле;
   г) творца;

Репозиторий БГМУ

д) шчаслівы.

**4. Адзначце словы, у якіх літар больш, чым гукаў:**

а) роўнядзь;

б) французскі;

в) прыязджаць;

г) аб'ява;

д) пагалоўе.

**5. Адзначце словы, у якіх спалучэнне дз абазначае адзін гук:**

а) будзённы;

б) падзямелле;

в) падзарадка;

г) падзолісты;

д) падзяка.

**6. Адзначце словы, у якіх спалучэнне дж абазначае два гукі:**

а) агароджа;

б) ураджайны;

в) аджыць;

г) паджаць;

д) аджартавацца.

**7. Адзначце словы, у якіх літара е абазначае два гукі:**

а) песня;

б) елачка;

в) ваенны;

г) паснедалі;

д) аб'езд.

**8. Адзначце словы, у якіх літара ё абазначае адзін гук:**

а) жыццёвы;

б) ёд;

в) паштальён;

г) цыбур'ё;

д) булён.

**9. Адзначце словы, у якіх два мяккія зычныя:**

а) чацвёрты;

б) разьбяр;

в) змена;

г) скінуў;

д) елачкі.

**10. Адзначце словы, у якіх адбываецца прыпадабненне глухіх зычных да звонкіх:**

а) ад печы;

б) касьба;

в) вакзал;

Репозиторий БГМУ

г) жаніцьба;
д) зборнік.

**11. Адзначце словы, у якіх адбываецца прыпадабненне шыпячых зычных да свісцячых:**
а) рэзчык;
б) падабаешся;
в) пясчаны;
г) па адной лыжцы;
д) у дзежцы.

**12. Адзначце словы, у якіх адбываецца прыпадабненне свісцячых зычных да шыпячых:**
а) расчапіць;
б) расказчык;
в) разжаць;
г) пераможца;
д) на лодачцы.

**13. Адзначце словы, у якіх адбываецца прыпадабненне звонкіх зычных да глухіх:**
а) мігцець;
б) просьба;
в) мароз;
г) адшумець;
д) прысядзьце.

**14. Адзначце словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук [*ц*]:**
а) (у) палацы;
б) (у) спрэчцы;
в) (на) кветцы;
г) жыццё;
д) (на) дзежцы.

**15. Адзначце двухскладовыя словы:**
а) пограб;
б) аул;
в) канвеер;
г) жоўты;
д) страус.

**16. Адзначце словы, якія правільна падзелены на склады:**
а) а-пра-ну-ты;
б) буль-ба;
в) а-гле-дзе-цца;
г) кос-ка;
д) аз-іяц-кі.

Репозиторий БГПУ

**17. Адзначце радкі, дзе абедзве выдзеленыя галосныя з’яўляюцца націскнымі:**

а) к*у*жаль, п*е*ставаць;
б) кал*і*ўца, к*а*менны;
в) інстр*у*мент, адз*і*наццаць;
г) навін*а*, н*а*нач;
д) зд*а*ўна, л*а*савацца.

**18. Адзначце словы, у якіх няправільна выдзелены націскныя склады:**

а) дз*е*сяцера;
б) нажн*і*цы;
в) каж*а*н;
г) прызб*а*;
д) гушч*а*р.

**19. Адзначце радкі, у якіх усе падкрэсленыя галосныя абазначаюць націскныя гукі:**

а) смуг*а*, кар*у*нкі;
б) в*ы*чварны, жыв*і*цца;
в) пас*а*г, скрыж*а*лі;
г) індустр*ы*я, чат*ы*рнаццаць;
д) касц*я*ны, н*у*длівы.

**20. Адзначце словы з другім націскным складам:**

а) данізу;
б) ганьба;
в) слабы;
г) жальба;
д) стары.

**21. Запішыце словы, якія вымаўляюцца так:**

[*п’ашчотны*], [*шчарс’ц’в’элы*]

**22. Знайдзіце слова, у якім адбываецца прыпадабненне свісцячага да шыпячага. Запішыце, як вымаўляецца гэта слова:**

а) сцежка;
б) (на) кветцы;
в) катэдж;
г) расчоска;
д) шчымлівы.

## Тэст № 2

**1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца *а*:**

а) с..кратар;

Репозиторий БГМУ

б) д..лікатны;
в) кр..шыць;
г) ж..лезны;
д) лат..рэя.

**2. Адзначце словы, пры змене якіх назіраецца змена месца націску:**

а) воўк;
б) востраў;
в) вуліца;
г) вёска;
д) лось.

**3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца *э*:**

а) бухгалт..р;
б) прынт..р;
в) р..сора;
г) Ц..лінаград;
д) прац..жваць.

**4. Адзначце словы, у якіх пішацца *я*:**

а) г..рань;
б) ..фрэйтар;
в) б..змежны;
г) св..ткаванне;
д) дроб..зь.

**5. Адзначце словы, у якіх пішацца *е*:**

а) дз..вяты;
б) с..кунда;
в) б..злюдны;
г) п..нал;
д) с..мнаццаць.

**6. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць *ы*:**

а) лод..р;
б) зар..ва;
в) ц..рымонія;
г) р..монт;
д) кр..вавы.

**7. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць *і*:**

а) ад..мжэць;
б) звыш..мклівы;
в) за..кацца;
г) у ..мхах;
д) ад..граць.

**8. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць *о*:**

а) ф..таграфія;
б) ф..таздымак;
в) м..тасані;
г) гр..смайстар;
д) м..вазнаўства.

**9. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць *ў*:**
а) паўночна-..сходні;
б) а..дыенцыя;
в) а...л;
г) шлагба..м;
д) лака..т.

**10. Адзначце словы з памылковым напісаннем:**
а) Рэмбрандт;
б) капустны;
в) праяздны;
г) расада;
д) расчасаць валасы.

**11. Адзначце словы з марфалагічным падваеннем:**
а) ралля;
б) жыццё;
в) бяззубы;
г) насценны;
д) ванна.

**12. Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак:**
а) восен..скі;
б) лепел..скі;
в) падз..му;
г) фантан..чык;
д) восем..сот.

**13. Адзначце словы, у якіх пішацца апостраф:**
а) кап..ё;
б) інтэрв..ю;
в) нал..ю;
г) сустрэн..ся;
д) трох..ярусны.

**14. Адзначце словы, у якіх пішацца вялікая літара:**
а) (Дз,дз)ень донара;
б) (С,с)карыназнавец;
в) (А,а)рыядніна нітка;
г) (Дз,дз)ень будаўніка;
д) (Д,д)ом літаратара.

**15. Адзначце словы з памылковым напісаннем:**



Репозиторий БГМУ

а) акардыён;
б) біясфера;
в) аксіёма;
г) акеан;
д) харыяграфія.

**16. Адзначце правільна напісаныя словы:**

а) рассольнік;
б) прыгоніцтва;
в) мышьяк;
г) лыжка;
д) мянтуз.

## Тэст № 3
## (Арфаграфія, марфалогія і словаўтварэнне)

### Частка А

**1. Адзначце словы, у якіх вымаўленне і напісанне не супадае:**

а) бярэзнік;
б) на карце;
в) не еў;
г) дачка і сын;
д) джунглі.

**2. Адзначце словы, у якіх пры змене ліку змяняецца месца націску:**

а) парта;
б) змяя;
в) секунда;
г) вядро;
д) кажан.

**3. Адзначце словы, у якіх пішацца *я*:**

а) м..нціць;
б) ба..здольны ;
в) н..стрымана;
г) ..хідны;
д) м..нзурка.

**4. Адзначце словы, у якіх пішацца *ў*:**

а) па..за;
б) па-..збекску;
в) а..дыенцыя;
г) вышэй ..забрацца;



Репозиторий БГМУ

д) ла..ровы.

5. **Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак:**
   а) сляз..мі;
   б) соцен..ка;
   в) п..еса;
   г) студзен..скі;
   д) восем..сот.
6. **Адзначце словы, у якіх пішацца апостраф:**
   а) камус..ці;
   б) шчаў..е;
   в) раз..юшаны;
   г) аб..ехаць;
   д) В..етнам.
7. **Адзначце словы з памылковым напісаннем:**
   а) конягадоўля ;
   б) Велікабрытанія;
   в) курадым;
   г) часопіс;
   д) золатавалосы.
8. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара *е*.**
   а) с..лекцыя;
   б) ..страбіны;
   в) л..бяда;
   г) в..лікаваты;
   д) неразб..рыха.
9. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара *ы*:**
   а) вяноч..к;
   б) кр..шыць;
   в) ц..рымоніцца;
   г) опт..ка.
   д) шч..мліва.
10. **Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:**
   а) (В,в)асілеў дзённік;
   б) (У,у)сходнія славяне;
   в) (Р,р)эктар універсітэта;
   г) аўтамабіль (В,в)ольва;
   д) (М,м)лечны (Ш,ш)лях.
11. **Адзначце словы, пры змяненні якіх у месным склоне адбываецца чаргаванне зычных:**
   а) почырк;
   б) сукенка;
   в) рука;



Репозиторий БГМУ

г) сцяг;
д) Надзейка.

**12. Адзначце словы, якія не маюць формы множнага ліку:**

а) пано;
б) адзенне;
в) калоссе;
г) матыў;
д) сорам.

**13. Адзначце назоўнікі з канчаткамі -*у*, -*ю*:**

а) з век ...у век;
б) луста хлеб..;
в) сын палк..;
г) таблеткі ад кашл..;
д) кілаграм цукр...

**14. Адзначце назоўнікі, якія ў месным склоне маюць канчаткі -*у*, -*ю*:**

а) каваль;
б) артыст;
в) пастух;
г) Фёдар;
д) бераг.

**15. Адзначце адушаўлёныя назоўнікі:**

а) вепр;
б) батальён;
в) народ;
г) русалка;
д) нябожчык.

**16. Адзначце якасныя прыметнікі:**

а) гарадскі жыхар;
б) залаты характар;
в) фальшывы дакумент;
г) буланы конь;
д) сярэбраны пярсцёнак.

**17. Адзначце дзеясловы з правільнымі асабовымі канчаткамі:**

а) ён піша;
б) вы зберажэце;
в) вы азіраіце;
г) ён маладзее;
д) вы ядзіце.

**18. Адзначце дзеясловы другога спражэння:**

а) бегчы;
б) спаць;
в) залежаць;



Репозиторий БГМУ

г) несці;
д) пагражаць.

**19. Адзначце нарматыўныя дзеепрыметнікі:**
а) асыпаўшаяся лісце;
б) спечанная бульба;
в) зламаная галінка;
г) замёрзлае акно;
д) пасеятае жыта.

**20. Адзначце словы, што пішуцца праз злучок:**
а) (віцэ) адмірал;
б) (контр) наступленне;
в) (даўным) даўно;
г) (сацыял) дэмакратычны;
д) (па) баявому.

**21. Адзначце словазлучэнні, у якіх не пішацца разам:**
а) (не)высокі чалавек;
б) (не)разлічваючы на дапамогу;
в) пісьмо (не)напісана;
г) (не)даварыць суп;
д) (не) памытая падлога.

**22. Адзначце сказы, у якіх трэба ўставіць *ні*.**
а) Як тут (не, ні) сказаць!
б) (Не, ні) раз мне даводзілася быць у гэтых мясцінах.
в) На небе (не, ні) хмурынкі.
г) Дзе (не, ні) пойдзеш, песні кружаць роем.
д) Алесь сядзеў (не, ні) жывы (не, ні) мёртвы.

**23. Адзначце словы, якія спалучаюцца з лічэбнікам *чацвёра*.**
а) гады, дзверы, вераб'і;
б) паляўнічыя, кураняты, дзеці;
в) студэнты, кнігі, сталы;
г) мы, рабочыя, сані;
д) ваверчаняты, суткі, вучні.

**24. Адзначце словы, утвораныя бяссуфіксным спосабам:**
а) догляд;
б) бязвусы;
в) бель;
г) купля;
д) сіняваты.

**25. Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:**
а) загарадзіць;
б) узнагарода;

в) падлесак;
г) увечары;
д) бягом.

## ЧАСТКА В.

**1. Запішыце лічэбнік у патрэбнай форме:**
– з 523 хлопцамі.

**2. Знайдзіце слова, напісанае з памылкай, і запішыце яго правільна:**
а) сажанцы;
б) раззлавацца;
в) расада;
г) расчуліцца;
д) расшчодрыцца.

**3. Ад наступнага дзеяслова ўтварыце дзеепрыметнік і запішыце:**
– скінуць.

**4. Ад наступнага дзеяслова ўтварыце дзеепрыслоўе і запішыце:**
– выкруціць.

**5. Ад наступнага словазлучэння ўтварыце складаны прыметнік і запішыце:**
– ружовыя шчокі.

## ТЭСТ № 4
## (СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ)

**1. Адзначце дзеяслоўныя словазлучэнні:**
а) імкненне выйграць;
б) вымытая падлога;
в) хутка ісці;
г) уваход у тэатр;
д) выканаўшы заданне.

**2. Адзначце складаныя словазлучэнні:**
а) жыў адзін-адзінюткі;
б) перакуліць уверх дном;
в) дуб у два абхваты;
г) самы дарагі падарунак;
д) давайце дапаможам сябру.

**3. Адзначце словазлучэнні, у якіх залежнае слова дапасуецца да галоўнага:**



Репозиторий БГМУ

а) пяты кіламетр;
б) шанаваць прыроду;
в) якісьці незнаёмец;
г) намаляваны алоўкамі;
д) скошаны луг.

**4. Адзначце словазлучэнні, у якіх словы звязаны кіраваннем:**
а) выкананы ўсімі;
б) ад гэтых поспехаў;
в) тры газеты;
г) дарога каля лесу;
д) прачытаны дыктарам.

**5. Адзначце словазлучэнні, у якіх словы звязаны прымыканнем:**
а) з’еўшы абед;
б) даўно знаёмы;
в) удвая мацней;
г) жыць у горадзе;
д) надзвычай прыемны.

**6. Адзначце пэўна-асабовыя сказы:**
а) Напішы яму, Алеська, ды хутчэй.
б) Завярнуў з вуліцы сцежкаю да рэчкі.
в) Хутка выберуся ад вас.
г) Завод пабудавалі гады тры назад.
д) Ці паедзеце сёлета да сваіх?

**7. Адзначце абагульнена-асабовыя сказы:**
а) Не рабі ліхога і не бойся нікога.
б) Не заснеш у весні вечар.
в) Аднымі рукамі нямнога зробіш.
г) Навошта ж выходзіць так рана з хаты?
д) У газетных кіёсках можна купіць канверты, маркі, аўтаручкі.

**8. Адзначце няпоўныя сказы:**
а) А назаўтра два лісты.
б) Алаіза з сяброўкай узышлі на ўзгорак.
в) Над галавой — сіняе неба.
г) Праз паўгадзіны яны сядзелі ў скверы.
д) У душу ўваходзіць нешта новае.

**9. Адзначце сказы з састаўным дзеяслоўным выказнікам:**
а) Я магу прапанаваць табе і іншы варыянт.
б) Мечык нібы заснуў.
в) Тады Пятрусь узяў ды падказаў сябру рашэнне.
г) Школа, я рад сустрэцца з табою.
д) Праезд часова закрыты.

**10. Адзначце сказы з састаўным іменным выказнікам:**

Репозиторий БГМУ

а) З гэтай вясны Мітрыч быў у іх за брыгадзіра.
б) Усе ціснуцца-лезуць наперад.
в) Маю надзею толькі на вас.
г) Конь усё яшчэ стаяў запрэжаны.
д) Жанчына была ў вясновым паліто.

**11. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца працяжнік:**

а) Грош .. цана такой рабоце.
б) Грыбоў .. хоць касой касі.
в) Умець .. за плячыма не насіць.
г) Пількаўшчына .. вёска невялікая, чыстая і прыгожая.
д) Страшэнны штукар і свавольнік .. гэты Нёман.

**12. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прамымі дапаўненнямі:**

а) *Нікога* і *нічога* ў тую ноч не бачылі.
б) Трэба *«Новую зямлю»* ў бібліятэку аднесці.
в) Поле жыло ўжо іншым *настроем*.
г) Зубр стаяў *пад* старымі *елкамі*.
д) *Сэрца* радуецца ад кожнай добрай весткі.

**13. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца ўскоснымі дапаўненнямі:**

а) Заўтра *ўсім* неабходна прынесці спартыўную форму.
б) Яго ў апошнія гады мацней пацягнула *на ўспаміны*.
в) Сумленны чалавек *іншага* не падмане.
г) Горад дыхае *спёкаю*.
д) Маці дала мне *мову*, як спадчыну і запавет.

**14. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прыдаткамі:**

а) У гэты самы час каля *возера* Валовае сустрэлася некалькі чалавек.
б) *Дзед* Аляксей ніколі ў жыцці не адступаў ад законаў.
в) Зусім недалёка Свіслач з *вартавымі*-дубамі на ўзбярэжжы.
г) Недзе побач падаў голас дрозд-*белабровік*.
д) Чырвоны касцёл знаходзіцца на плошчы *Незалежнасці*.

**15. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца акалічнасцямі:**

а) Такое гасціннае запрашэнне *зайсці* ўсё ж здзівіла.
б) *Пасярэдзіне двара* стаяла вялізная будыніна.
в) Прыглушаны шэпт змяніўся размовай *уголас*.
г) Нарэшце стужка Свіслачы затрапяталася *наперадзе*.
д) У лесе стаіць драўляны дом *з паўкруглымі шклянымі верандамі*.

**16. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца аднароднымі членамі сказа:**



Рэпазіторый БДПУ

а) На стале *сіпіць* і *сіпіць* роўным бляклым святлом лямпа.

б) Вецер то *лётаў*, то *бегаў* па хмызняках.

в) Па шашы хутка *аддаляўся-меншаў* магутны гул дызеляў.

г) *Ішоў* полем, *ішоў* сёламі.

д) Родзіць буйна наша *поле*, *сады* нашы, *агароды*.

**17. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца аднароднымі азначэннямі:**

а) Цёмна-зялёны дыван *шыракапёрага маладога* жыта ўкрываў зямлю.

б) Дзьмуў *нямоцны*, але *пякучы* вецер.

в) Ноч стаяла *халодная*, *хмарная*, але *без дажджу*.

г) Па *празрыстым*, *вымытым* пасля навальніцы небе плылі воблачкі.

д) Спаў ён на *шырокай непафарбаванай* лаўцы.

**18. Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў ставяцца коскі:**

а) Над абрывістым берагам Нёмана стаяў стары .. прысадзісты .. тоўсты дуб.

б) Чайкі-рыбаловы лёталі над намі .. і над ракой .. і над лугам.

в) Але я не спыняўся .. махаў і махаў касою.

г) Зранку .. ці ў абед .. або адразу папалудні нас збіраў старшыня.

д) Шалашык наш .. не наш, а службу служыць.

**19. Колькі і якіх знакаў прыпынку павінна быць у наступным сказе:**

Усе дрэвы ліпы і бярозы каля хат вішні і яблыні ў садзе асіны ў недалёкім лесе адлівалі незвычайна лагодным сонечным святлом.

а) двукроп'е, тры коскі;

б) двукроп'е, дзве коскі, працяжнік;

в) двукроп'е, тры коскі, працяжнік;

г) два працяжнікі, тры коскі;

д) дужкі, двукроп'е, дзве коскі.

**20. Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў ставяцца коскі:**

а) І раптам сярод іншых паперак рука мая натрапіла на … складзены ў чатыры столкі … аркуш пергаменту.

б) З выгляду спакойны і стрыманы … Даніла Мікалаевіч у душы хваляваўся не менш за маёра.

в) У мяне з'яўляецца адна думка … падаць у гэтую камісію свае запіскі і лісты.

г) Жыццярадасны, вясёлы, па натуры аптыміст … Пятро Пятровіч любіў пасмяяцца, пажартаваць.

д) Усё навокал жыло і варушылася … сагрэтае цяплом веснавога дня.

**21. Адзначце пункты, у якіх выдзеленыя члены сказа адасабляюцца.**

а) Зараз знойдзецца паблізу недзе такоўская скрынка, што *на бок паставіўшы* і сесці льга.



Рэпазіторый БДПУ

б) Вецер *нібы знарок* пазганяў хмары з неба.

в) Нам трэба было стаяць *не дыхаючы*.

г) Не хваліся *нажаўшыся*, а хваліся змалаціўшы.

д) Я вярнуўся ў пакой і *не запальваючы свечкі* сеў на ложак.

**22. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска:**

а) Слоў з яго сыпалася .. як гароху.

б) Спярша прайшла паўз будынак кампанія такіх .. як ён, Мечык, хлопцаў.

в) Дагэтуль у беларускай мове захавалася слова «пярун» .. як абазначэнне ўдару маланкі.

г) Івану Сароку хацелася .. як найхутчэй скончыць снеданне і ісці на працу.

д) Мінула, здаецца, больш .. як паўгода пасля гэтага выпадку пад старой бярозай.

**23. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца ўдакладняльнымі членамі сказа:**

а) На жаль, дарога была кепская *ў выбоінах*.

б) У вялізным пакоі абапал расчыненага ў сад акна *ў мяккіх крэслах* сядзелі дзве жанчыны.

в) Калісь *гадоў пяць таму* я тут ужо быў.

г) Сядзім, маўчым, думаем і раптам чуем галасы непадалёк *ля першай зямлянкі*.

д) У былым замку *ў Гродне* выключны па багацці і пазнавальнасці, вельмі ўмела пабудаваны музей.

**24. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца адасобленымі дапаўненнямі:**

а) А Васька *замест адказу* развярнуўся — і дзёру.

б) Я люблю Беларусь *сваю маці цудоўную*.

в) Мароз *апроч таго* яшчэ займаўся і самадзейнасцю.

г) Увесь месяц *за выключэннем хіба толькі апошняй нядзелі* прысвечаны быў падрыхтоўцы да выставы.

д) д) Сёння Андрэйку трэба было падзяжурыць *замест дзеда*.

**25. Адзначце сказы, у якіх выдзелены ўстаўныя канструкцыі:**

а) *Паводле ўяўленняў нашых продкаў* курыныя яйкі ўвасаблялі творчыя, жыццёвыя сілы прыроды.

б) Рыгор Андрэевіч Угоднік *такое было яго прозвішча* ляжаў на цвёрдым ложку.

в) Мая карта рэк *а на ёй памечаны толькі рэкі, даўжэйшыя за пяць кіламетраў* уся пранізана сінімі жылкамі…

г) Ляляк *казадой* страсна крычыць сваё «люблю».

д) Вам жа *вядомая рэч* патрэбен адпачынак.

**26. Адзначце пункты, у якіх выдзелены пабочныя канструкцыі:**



Рэпазіторый БДПУ

а) *Здаецца* сам свет гатовіўся як можна лепш сустрэць калядны вечар.

б) *Бывае* што прывязуць у краму свежага тавару.

в) *Як ён сам мне прызнаўся* становішча яго было недарэчнае.

г) А на справе *аказалася* трошкі не так.

д) Увечары *бывала* раскіне антэну на грушыне і слухае.

**27. Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў ставяцца коскі:**

а) У вёсках знойдуцца хаты, у якіх .. бадай .. кожны дзень павернецца паўсяла людзей.

б) Праўда .. не заўсёды ў паштовай сумцы радасныя весткі.

в) Дарэмна .. аднак .. мы правандравалі тут ад раніцы да поўдня.

г) У нас .. можа .. тысячы рабочых.

д) А раней .. я сам яшчэ помню .. параходы хадзілі да Оршы.

**28. Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў ставяцца коскі:**

а) Будзеш .. Арынка .. сягоння на сходзе?

б) Закукуй .. зязюля .. закукуй .. шэрая .. для мяне.

в) Лявон, братка, а ты .. чаго зажурыўся?

г) А .. Надзея Варывонаўна, сядайце.

д) Гэта ж не дрэва, мой ты .. сынок.

**29. Колькі і якіх знакаў прыпынку павінна быць у наступным сказе?**

Іван Карпячонак Гаршчок або Карпавіч так звалі яго усе калі пабыў у свеце належаў да той даўняй і немалой чарады выхаджэнцаў з беларускай вёскі каторая чакае яшчэ ў літаратуры свайго пісьменніка.

а) 6 косак, дужкі;

б) 5 косак;

в) 4 коскі, дужкі;

г) 3 коскі, дужкі;

д) 3 коскі, працяжнік.

**30. Адзначце сказы з прамым парадкам слоў:**

а) Але ж лекавыя травы трэба сушыць не на сонцы, а ў цяньку на ветры.

б) Атрэсеныя яблыкі і грушы насыпаны былі ў сенцах.

в) У спецыяльна зробленых падстаўках стаялі скрыні з кветкамі.

г) Вяселле ў розных мясцінах таксама рознае.

д) Весялейшы і поле мае погляд.



Репозиторий БГПУ

## Кантрольны тэст

### Частка А

**1. Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:**
а) злёгку;
б) джэм;
в) зніклі;
г) сфера;
д) восеньскія.

**2. Адзначце радкі, дзе ўсе выдзеленыя літары ў абодвух словах абазначаюць націскныя галосныя:**
а) атрым*а*ны, в*у*сы;
б) кв*а*ртал, в*ы*селкі;
в) агрэст, з*а*гадзя;
г) жых*а*р, ц*я*жар;
д) пр*ы*від, рэгент.

**3. Адзначце словы, дзе пішацца мяккі знак:**
а) вішан..ка;
б) выц..вілы;
в) манпанс..е;
г) восем..;
д) завес..ся.

**4. Адзначце словы, дзе пішацца *э*:**
а) ц..ментаваць;
б) ас..нсаваць;
в) камп'ют..р;
г) рэзюм..;
д) кр..пасны.

**5. Адзначце словы, у якіх трэба пісаць *ў*:**
а) Крэўская ..нія;
б) дачушка- ..цеха;
в) накда..н;
г) але..т;
д) а..л.

**6. Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:**
а) вёска (Ж,ж)оўты (Б,б)род;
б) (А,а)рыядніна нітка;
в) (М,м)лечны (Ш,ш)лях;
г) новыя (Д,д)астаеўскія;
д) (К,к)упалаўская гераіня.

**7. Адзначце назоўнікі, пры змяненні якіх у месным склоне адбываецца чаргаванне зычных у аснове слова:**

а) стог;
б) рука;
в) Пецярбург;
г) дачка;
д) сцяг.

**8. Адзначце словы, дзе пішацца *я*:**

а) ідэ..ліст;
б) в..лікадзяржаўны;
в) п..рон;
г) ві..ланчэль;
д) земл..мер.

**9. Адзначце словы з падоўжанымі зычнымі:**

а) палес..кі;
б) калос..е;
в) акон..ы;
г) суд..зя;
д) карэн..е.

**10. Адзначце сінанімічныя рады:**

а) сябар, таварыш, знаёмы;
б) пах, водар, духмянасць;
в) ісці, крочыць, шыбаваць;
г) нявеста, нявестка;
д) церці, муляць, націраць.

**11. Адзначце амографы:**

а) штосьці сказаў – некалькі сказаў
б) смачныя малінаўкі – пяюць малінаўкі
в) прыйшлі тры вучні – добра тры пляму
г) каля кухоннага стала – стала холадна
д) прыехаў дамоў – не бачу дамоў

**12. Адзначце словы, што пішуцца праз злучок:**

а) сельска..гаспадарчы;
б) міні..футбол;
в) кісла..салодкі;
г) Паўночна..Казахстанская вобласць;
д) паўночна..беларускі.

**13. Адзначце назоўнікі з канчаткамі -*у*, -*ю*:**

а) пах мёд..;
б) у рытме танц..;
в) аматар спорт..;
г) жыць пры Алег..;

Репозиторий БГМУ

д) рысы твар...

**14. Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:**

а) поні;

б) круп’е;

в) урду;

г) кашпо;

д) сулугуні.

**15. Адзначце адушаўлёныя назоўнікі:**

а) армія;

б) народ;

в) валет;

г) вадзянік;

д) гном.

**16. Адзначце правільна напісаныя лічэбнікі:**

а) паўтары кілаграма;

б) сяммю рублямі;

в) абодзвюма сяброўкамі;

г) двухсоты пакупнік;

д) тры пятых участка.

**17. Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:**

а) першакурснік;

б) зацішак;

в) пераносіца;

г) паводка;

д) пераехаць.

**18. Адзначце характэрныя для беларускай мовы формы дзеепрыметнікаў:**

а) пажаўцеўшае лісце;

б) развяваючыяся сцягі;

в) прывезеныя дровы;

г) шапочучая асака;

д) сагнуты цвік.

**19. Адзначце сказы, у якіх дзеепрыслоўі ўтвораны і ўжыты правільна:**

а) Саломку выгнуўшы дугою, звісае колас над зямлёю.

б) На чужы лоб сягаючы, трэба і свой падставіць.

в) Пад’язджаючы да горада, у нас сапсаваўся аўтобус.

г) Удыхаючы густы пах багуну, кружылася галава.

д) Старэйшае пакаленне, не шкадуя жыцця, аддавала свае сілы ў барацьбе з ворагам.

**20. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, дзе *не* пішацца асобна:**



Репозиторий БГМУ

а) (не) прадуманы мною адказ;
б) (не) маладыя, а пажылы;
в) (не) дагледзець дзіця;
г) надзвычай (не) ўдалая праца;
д) (не) пахісны ў барацьбе.

**21. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ўжываецца *ні*:**

а) Якія тут рэцэпты .. пішы ніякая не выручыць аптэка.
б) Сівер твары нам сек .. раз.
в) Калі .. сёння, дык праз гады ты мусіш з далечы з'явіцца.
г) Камбайны .. мінуты не стаялі.
д) Куды .. кінь — усюды клін.

**22. Адзначце сказы, дзе неабходна паставіць працяжнік:**

а) Ліпень у нас самы гарачы месяц.
б) А дзядзька раптам гоп налева.
в) Экзамен не свята, а адказная праца.
г) Дбайная гаспадыня цётка Ганна.
д) Ноч хоць іголкі збірай.

**23. Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ва ўжыванні займеннікаў:**

а) Жаласць да самога сабе агарнула Пракопа.
б) І жаба сябе хваліць.
в) Другіх асуджае, а ў самай не ўсё ладна.
г) Любі другога, як сабе самога.
д) Я не прынёс цябе ніводнай кветачкі.

**24. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:**

а) Як кудзеля .. тая траўка.
б) Як працавіты дрывасек .. гром уздыхаў і грукаў глуха.
в) Рукі .. што граблі.
г) Хлопцы беглі .. як жару ўхапіўшы.
д) І дзе на свеце ёсць такая .. як Нёман рэчачка другая.

**25. Адзначце сказы, дзе знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

а) У вышыні, у блакітнай далі, гучна жаваранкі заспявалі.
б) Мы беглі, спатыкаючыся і падаючы.
в) Там каля хаты, у садочку схіліўшысь ціхенька ў куточку, стаялі дзве вярбы старыя.
г) Наставіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць буслы.
д) Сіратлівы бусел задумаўшыся стаяў на адной назе.

**26. Адзначце сказы, дзе пунктуацыю трэба дапоўніць коскамі ці коскай:**

а) Расціце малыя, Радзіму любіце, сардэчна шануйце руплівых бацькоў.



Рэпазіторый БГМУ

б) Як расказвала маці ён рос маўчуном.

в) Мілая паслухай голас горада, гукі старажытных камяніц.

г) Гэты крыжык мне на шчасце падарыла маці.

д) Рака ў возеры здаецца блакітнай.

**27. Адзначце сказы, у якіх прыдаткі павінны адасабляцца:**

а) У беларускіх лясах водзіцца жаўна або чорны дзяцел.

б) Самай выдатнай фігурай Адраджэння быў сын купца з Полацка Францыск Скарына.

в) Яе сарамлівую дзяўчыну выбралі тады членам праўлення.

г) На Палессі на самым поўдні Беларусі ёсць куточак зямлі асабліва мілы майму сэрцу.

д) Сарокі вестуны зімы матляюць сваёй стракатасцю на ўраджайных рабінах.

**28. Адзначце сказы, дзе пунктуацыю трэба дапоўніць:**

а) Усё разам: і хаты, і поле, і дарога чарнела ад асенняй імглы і туману.

б) У кожнага партызана на грудзях або на капелюшы ці кепі красавалася чырвоная стужка.

в) Васіль стаяў ні жывы ні мёртвы.

г) Ні месяца ні зорак зусім не было відаць.

д) У хаце і ў клеці, у клуні і хлявах дабра было многа.

**29. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца коскамі:**

а) На голых дрэвах *замест лісця* паклалі шэрань маразы.

б) Як толькі ўзнімаецца ўгару *абмытае росамі* сонца, разам пачнуць свой ранішні спеў птушкі.

в) Людзі неслі ваду *добра, што рачулка была побач*! І хутка ўнізе полымя з ліпы збілі.

г) У паветры *вільготным ад блізкай ракі* прыемна пахне шыпшынай.

д) Суніцы *буйныя, спелыя, з жоўтымі зярняткамі на баках* так і вабілі да сябе.

**30. Адзначце сказы, дзе пунктуацыю трэба дапоўніць коскай:**

а) Спадала лета ішоў ранні верасень.

б) Навокал адно гніла куп’істая дрыгва ды моўклі панурыя лясы.

в) То гром пракоціцца ў хмарах то грукне над лесам пярун.

г) Ён лёгка павёў рукой і палілася песня.

д) Вечарэе і пахне кветкамі.

**31. Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць двукроп’е:**

а) Хацеў сказаць слова язык не паварушыўся.

б) Я ведаў здаўна яблыні, як кветкі без чалавечай любові расці не будуць.

в) На ўзгорку Сцяпан спыніўся як прыгожа тут.

г) Багата снегу багата хлеба.

д) Я верыў без цябе не засумую.

**32. Адзначце сказы, дзе дадзеныя часткі звязаны з галоўнымі пры дапамозе злучальнага слова.**

а) У памяці засталася хвіліна, калі зусім адступіла вузкая цёмная рыска зямлі і перад вачыма адкрыўся бязмежны вольны вадзяны шлях.

б) Хто птушку пакрыўдзіць, той сам сабе здрадзіць.

в) Тады ж я нічога не баяўся, бо нічога не ведаў.

г) Вечарамі ў Міканоравай хаце меркавалі, як абжывацца, дзе нешта будаваць.

д) Я горка ўсміхнуўся праз слёзы, таму што не плача мужчына.

**33. Адзначце сказы з пунктуацыйнымі памылкамі:**

а) Людзі ніколі не забудуць пра тое, як, намагаючы ўсе сілы, вытрымалі страшэнную блакаду жыхары Ленінграда.

б) У хаце запахла дымам – вецер забіваў комін, і праз гэта ў печы не загараліся дровы.

в) Аленка казала, што, калі раніца будзе цёплай, то пойдзем па шчаўе.

г) Пра спадчыну, якая засталася, і якую трэба перадаць, чалавек думаў спрадвеку.

д) Не пытайся, які гаспадар, калі вароты падаюць, а колы рыпяць.

## Частка B

**1. Запішыце прыметнікі, якія не ўтвараюць ступені параўнання:**

а) ранішні;

б) смелы;

в) цёплы;

г) родны;

д) залацісты.

**2. Від пераносу значэння, пры якім ужываецца адзіночны лік замест множнага або множны замест адзіночнага, частка замест цэлага ці цэлае замест часткі — гэта…**

**3. Знайдзіце аднасастаўны сказ і выпішыце яго граматычную аснову:**

а) Палі ляжалі голыя, сумныя.

б) Набяру я зёлак, прынясу дадому.

в) Пяць дубоў шырока раскінулі свае кроны.

г) Было цёпла на вуліцы.

д) На доле — ягаднік-чарнічнік.

**4. Знайдзіце словазлучэнне з памылкай ў дзеяслоўным кіраванні, запішыце яго правільна:**

а) выбачаць сябру;
б) здзекавацца з чалавека;
в) сумавалі па блізкіх;
г) загадчык бібліятэкі;
д) паехалі па дровы.

**5. Знайдзіце памылку ў каардынацыі дзейніка і выказніка, запішыце выказнік у правільнай форме:**

а) Большасць паўстанцаў рассеялася, разышлася па хатах.
б) Мноства каляровых шароў узняліся пад самыя воблакі.
в) Чацвёра хлопцаў сядзела каля школы.
г) Хутка на двор уехала трое саней.
д) Тысячы людзей жывым патокам залівалі вуліцы.

**6. Запішыце лічэбнік словам у той форме, якой патрабуе словазлучэнне:**

– 800 гледачамі.

**7. Утварыце ад асновы дзеяслова *схіліць* дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу і запішыце яго ў пачатковай форме.**

## Літаратура


1. *Арашонкава, Г. У.* Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова. Мінск, 1987.
2. *Бадзевіч, З. І.* Беларуская мова : дапаможнік для падрыхтоўкі да экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання / З. І. Бадзевіч, Ж. Я. Белакурская, С. М. Якуба. Мінск, 2004.
3. *Бадзевіч, З. І.* Беларуская мова : Экзаменац. тэсты / З. І. Бадзевіч, Ж. Я. Белакурская, С. М. Якуба. Мінск, 2004.
4. *Бадзевіч, З. І.* Экзамен па беларускай мове : тэсты і даведачныя матэрыялы / З. І. Бадзевіч, Ж. Я. Белакурская, С. М. Якуба. Мінск, 2002.
5. *Бардовіч, А. М.* Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы : дапам. для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі / А. М. Бардовіч, Л. С. Мормыш, Л. М. Шакун. Мінск, 2005.
6. *Баханькоў, А. Я.* Тлумачальны слоўнік беларускай мовы для сярэдняй школы / А. Я. Баханькоў, І. М. Гайдукевіч, П. П. Шуба. Мінск, 1990.
7. *Беларуска-рускі* слоўнік для школьнікаў / аўт.-склад. А. М. Булыка. Мінск, 2002.
8. *Беларуская* мова. Дапаможнік для падрыхтоўкі : цэнтралізаванае тэсціраванне, адзіны экзамен / аўт.-склад. Л. А. Гіруцкая. Мінск, 2004.
9. *Беларуская* мова : дапам. для падрыхт. да цэнтраліз. тэставання / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь / пад рэд. В. М. Лапанік, Н. В. Самедавай. Мінск: РІКВ; Мазыр, 2005.
10. *Гаўрош, Н. В.* Фразеалагічны слоўнік для сярэдняй школы / Н. В. Гаўрош, І. Я. Лепешаў, Ф. М. Янкоўскі. Мінск, 1973.




Рэпазіторый БГМУ

11. *Грабчыкаў, С. М.* Слоўнік паронімаў беларускай мовы / С. М. Грабчыкаў. Мінск, 1994.

12. 2000 русских и 2000 белорусских идиом, фразеологизмов и устойчивых словосочетаний (Словарь с пояснениями и примерами использования) [Текст] / авт.-сост. Е. Л. Боярина, В. Н. Сивчиков. Минск, 2006.

13. *Зборнік* практыкаванняў па беларускай мове: дапаможнік. У 3 ч. Ч 1. Фанетыка, арфаэпія, графіка, арфаграфія, фразеалогія / Г. Ф. Андарала [і інш.] ; пад. агул. рэд. С. К. Бердніка. Мінск : БДПУ, 2007.

14. *Клышка, М. К.* Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М. К. Клышка. Мінск, 1993.

15. *Леванцэвіч, Л. В.* Беларуская мова : 27 урокаў з рэпетытарам : дапам. для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / Л. В. Леванцэвіч. Мінск, 2008.

16. *Міхайлаў, П. А.* Беларуская мова : тэматычны трэнажор : лексікалогія, фразеалогія, асновы стылістыкі : для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / П. А. Міхайлаў, С. І. Фацеева. Мінск, 2008.

17. *Паўрочны* кантроль па беларускай мове. Рознаўзроўневыя заданні. 9 кл. : для 11-гадовай агульнаадукацыйнай шк. / Уклад. В. Ф. Арцюшэнка. Мазыр, 2004.

18. *Сіўковіч, В. М.* Беларуская мова. Практыкум для старшакласнікаў і абітурыентаў / В. М. Сіўковіч. Мінск, 2005.

19. *Слоўнік* беларускай мовы : Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / пад рэд. В. М. Бірылы. Мінск, 1987.

20. *Смольская, Т. М.* Беларуская мова ў экзаменацыйных тэстах / Т. М. Смольская. Мінск, 2004.

21. *Сцяцко, М. І.* Праблемы нормы, культуры мовы / М. І. Сцяцко. Гродна, 1998.

22. *Сямешка, Л. І.* Курс беларускай мовы : падручнік / Л. І. Сямешка, І. Р. Шкраба, З. І. Бадзевіч. Мінск, 1996.

23. *Тэсты* : беларуская мова : матэрыялы для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / УА Рэсп. ін-т кантролю ведаў. Мазыр, 2003.

24. *Хмялеўская, А. У.* Паэтапная падрыхтоўка да тэсціравання па беларускай мове : дапам. для вучняў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі з рус. і бел. мовамі навучання, і абітурыентаў / А. У. Хмялеўская. Мінск, 2006.

25. *Хмялеўская, А. У.* Тэматычны кантроль па беларускай мове. 11-ы кл. : дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання з 11-гадовым тэрмінам навучання / А. У. Хмялеўская. Мінск, 2005.

26. *Цыбульская, С. І.* Беларуская мова : вучэб.-трэніров. тэсты для падрыхт. да тэсціравання і экзамену / С. І. Цыбульская. Мінск, 2005.

27. *Цэнтралізаванае* тэсціраванне. Беларуская мова : зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. Мінск, 2007.

28. *Янкоўскі, Ф. М.* Сучасная беларуская мова / Ф. М. Янкоўскі. Мінск, 1984.

## ЗМЕСТ

Кантрольныя работы ........................................................................3

Тэсты ..........................................................................................36

Літаратура...................................................................................58



Репозиторий БГПУ

Вучэбнае выданне

**Мядзведзь** Галіна Уладзіміраўна
**Слука** Вольга Уладзіміраўна

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Тэсты і кантрольныя работы

Адказны за выпуск В. У. Белы
У аутарскай рэдакцыі
Камп'ютэрны набор В. У. Слука
Камп'ютэрная вёрстка Н. В. Цішэвіч
Карэктар Ю. В. Кісялёва

Подписано в печать 26.06.08. Формат 60×84/16. Бумага писчая «КюмЛюкс».
Печать офсетная. Гарнитура «Times».
Усл. печ. л. 3,49. Уч.-изд. л. 2,65. Тираж 45 экз. Заказ 413.
Издатель и полиграфическое исполнение –
Белорусский государственный медицинский университет.
ЛИ № 02330/0133420 от 14.10.2004; ЛП № 02330/0131503 от 27.08.2004.
220030, г. Минск, Ленинградская, 6.

Репозиторий БГМУ